**Матэленак, І.** Малюе афганец пейзажы / І. Матэленак // Міёрскія навіны. — 2012. — 7 ліп. — С. 5.

## МАЛЮЕ АФГАНЕЦ ПЕЙЗАЖЫ

**Вячаслаў Стома пастаянна рыхтуе свае карціны да Дня горада. І сёлета мастак прывёз 20 палотнаў, у асноўным пейзажаў. Маляваннем ён захапляецца з дзяцінства, а ўжо 15 гадоў працуе з пэндзлем як прафесіянал. Нарадзіўся ў вёсцы Зялёны Лог (сучасная назва колішніх Хахулек). Служыў у арміі, стаў танкістам. Вучэбку закончыў у Пячах пад Барысавам, дзе за савецкім часам знаходзіўся вялікі палігон. Менавіта ў той час нашы войскі былі ўведзены ў Афганістан. А неўзабаве, 13 студзеня 1980-га, трапіў і Вячаслаў. Ён быў ужо гвардыі старшым сяржантам, камандзірам танка. Шмат разоў прымаў удзел у баявых аперацыях, успамінае, што кулі лёталі блізка, гінулі баявыя таварышы. І сам быў паранены.**

Пасля вайны паступіў у Віцебскі педуніверсітэт на мастацка-графічны факультэт. Потым пачаў займацца любімай справай прафеайна. Працуе мастаком у дзіцячым санаторыі «Расінка». А там усё добраўпарадкаванне праводзіцца па яго праектах і пры непасрэдным удзеле. Рыхтаваў персанальныя выставы карцін для раённага музея. А кожны твор патрабуе месяц-другі на абдумванне сюжэту і яго рэалізацыю. А усё астатняе залежыць ад занятасці, вольнага часу. Потым гэтыя творы ўпрыгожваюць жыллё родных і сяброў.

**Ігар Матэленак**